

# НАШ ГОЛАС



Выпуск № 7

*Газета для вучняў, настаўнікаў і бацькоў*













## *У гэтым нумары:*


- ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ;
- ПОМНІКІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў БЕЛАРУСІ;
- ПОМНІКІ ЛІДЧЫНЫ;
- ПАДЗЕІ МІНУЛАГА МЕСЯЦА;
- ШТО СВЯТКУЮЦЬ У МАІ;
- ДА ЎВАГІ

# ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ




Дзеля міру на Зямлі склалі свае галовы на алтар Айчыны прыкладна 27 мільёнаў савецкіх людзей. У агні Другой сусветнай вайны згарэлі тры мільёны беларусаў. У рэспубліцы няма ніводнай сям'і, якую б не закранула гэтая праклятая вайна.

Нядзіўна, што ў Беларусі 9 Мая — адно з самых светлых свят. Яно бясконца дарагое беларускаму народу, які разам з мільёнамі савецкіх людзей абараняў у Вялікай Айчыннай вайне суверэнітэт сваёй краіны, унёс свой уклад у вызваленне Еўропы ад фашысцкай навалы.



Менавіта беларусы, якія аднымі з першых прынялі на сябе ўдар гітлераўскай арміі пры нападзе на СССР, як ніхто іншы, выпрабавалі ўвесь цяжар той вайны. Скатаваная, але непакорная Беларусь, дзякуючы мужнасці і самаадданасці ўсяго насельніцтва, увайшла ў сусветную гісторыю як рэспубліка–партызанка.

Беларускі народ не схіліў галовы перад акупантамі і разам з іншымі братэрскімі народамі Савецкага Саюза стаў пераможцам у гэтай жорсткай і кровапралітнай вайне 20 стагоддзя. Дарагім коштам была заваявана незалежнасць. Таму сёння ў рэспубліцы аддаюць даніну вечнай памяці загінуўшым у баях за незалежнасць Радзімы і нізкі паклон тым, хто застаўся ў жывых, хто аднавіў з попелу народную гаспадарку.



У гэты дзень усе жыхары краіны выказваюць шчырую падзяку ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, якія не толькі выстаялі ў гэтай жудаснай вайне, але і сёння працягваюць весці нястомную працу па патрыятычным выхаванні моладзі.

Праходзяць дзесяцігоддзі, змяняюцца пакаленні, але Вялікая Перамога — сімвал нацыянальнага гонару, воінскай славы і доблесці — навечна ўпісана ў гераічны летапіс краіны.

# ПОМНІКІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў БЕЛАРУСІ



*Манумент Перамогі*



*Музей Вялікай Айчыннай Вайны*




*Лінія Сталіна*



*Мемарыяльны комплекс "Хатынь"*



*Брэсцкая крэпасць*



*Помнік Марату Казею*

# ПОМНІКІ ЛІДЧЫНЫ



## Курган Неўміручасці

Насыпанне кургана пачалося 9 мая 1966. Адчынены 8.07.1966 г. - скончана насыпанне. Уяўляе сабой пяціграннную піраміду вышынёй 7 *м*, з агульным перыметрам у аснове 55 *м*. У аснове кургана ўмацавана капсула, вакол якой пачалося насыпанне святой зямлі, прывезенай шматлікімі дэлегацыямі, якія прыбылі ў Ліду.

## Помнік у гонар воінаў-вызваліцеляў і партызан Лідскай зоны

У цэнтры горада ў скверы па вул. Савецкай у 1965 *г.* пабудаваны помнік савецкім воінам-вызваліцелям і партызанам са стэлай, на паўднёвым боку якой змешчаны загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага І.Сталіна.





## Скульптурны помнік на брацкай магіле

Знаходзіцца на вул. Міцкевіча, у гарадскім парку культуры і адпачынку.

У 1955 г на брацкай магіле ўсталяваны скульптурны помнік. Пахавана 7 воінаў, якія загінулі ў 1944 *г.* 1 мая 1985 *г.* па праекце архітэктара *Бураўкіна* ўзведзены помнік-стэла і 7 мемарыяльных пліт з прозвішчамі загінуўшых.

## Абеліск у скверы абутковай фабрыкі

Пабудаваны ў 1968 *г.* на вул. Фабрычнай. На ўвекавечанне памяці 32 працоўных і воінаў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Абеліск з бетону вышынёй 2 *м.*, ступеністая падстава на тры маршы, агароджа бетонная з 9 слупкоў. Увесь комплекс помніка ўпісаны ў пяціканцовую зорку, выкладзеную з бардзюрнага каменю. На пліце ўмацаваны шчыт, аўтамат і каска.



# ПАДЗЕІ МІНУЛАГА МЕСЯЦА



**У красавіку прашлі спаборніцтвы "Алімпійскія надзеі Беларусі" па летнім шматбор'і "Здароўе". Каманда, якая прадстаўляла нашу школу, заняла І месца.**

## Віншуем нашу каманду!

****************************



**Віншуем Рудзевіч Вольгу, якая заняла ІІ месца ў выставе-конкурсе "Партрэт ветэрана".**

****************************



**Віншуем Лукашэвіча Яна, які заняў ІІ месца ў раённым этапе рэспубліканскага конкурса дзіцячых работ "Здесь все свои" у намінацыі "Камп'ютарны плакат".**

****************************

**Віншуем каманду юных інспектараў руху "Святлафор" нашай школы, якая заняла ІІ месца ў раённых спаборніцтвах.**



****************************

**18.04.2015г. адбыўся раённы суботнік, у якім прынялі ўдзел вучні, настаўнікі і работнікі школы.**



# ШТО СВЯТКУЮЦЬ У МАІ

## 1 МАЯ – СВЯТА ПРАЦЫ



По сапраўднаму "масавым святам" 1 мая стаў у СССР. І гэта сапраўды было свята для савецкіх працоўных, якія атрымалі дадаткова два выхадныя дні.

Доўгі час дзень 1 мая адзначаўся як Дзень міжнароднай салідарнасці працоўных усіх краін. А ў 1997 годзе гэтае свята пераназвалі ў Свята вясны і працы.

## 5 МАЯ – ДЗЕНЬ ДРУКУ



Дзень друку штогод святкуецца 5 мая паводле Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь N 156 ад 2 мая 1996 года "Аб усталяванні ў Рэспубліцы Беларусь свята - Дня друку".

Гэтая дата, 5 мая, пачынае сваю гісторыю ад першага выхаду ленінскай "Праўды" у 1912 годзе. Хаця беларускі друк мае значна глыбейшыя карані і нямала знамянальных дат.

## 7 МАЯ – ДЗЕНЬ РАДЫЁ




У гэты дзень віншаванні з прафесійнай імпрэзай прымаюць людзі, якіх мала хто ведае ў твар. Аднак, іх галасы знаёмыя тысячам слухачоў.

Дзень 7 мая ўвайшоў у гісторыю сусветнай навукі і тэхнікі як дзень нараджэння радыё. Менавіта ў гэты дзень у 1895 годзе на паседжанні Рускага фізіка-хімічнага грамадства расійскі вучоны Аляксандр Папоў выступіў з дакладам і дэманстрацыяй створанага ім першага ў свеце радыёпрыёмніка.

## 15 МАЯ – ДЗЕНЬ СЯМ’І

У наш час сям'я - гэта найважнае асяроддзе для захавання і перадачы з пакалення ў пакаленне культурных каштоўнасцей, нацыянальных традыцый. Сям’я маральна і матэрыяльна падтрымлівае дзяцей, старых і інвалідаў. Правядзенне Міжнароднага дня сям'і спрыяе падвышэнню статута сям'і і лепшаму разуменню яе надзённых праблем і запатрабаванняў.



# ДА ЎВАГІ

## Як правесці лета з карысцю?




1. Прытрымлівайцеся рэжыма дня – не затрымлівайцеся да поўдня ў ложку і не праводзьце ўсю ноч на дыскатэках. І чым меншы ўзрост вучня, тым больш строга павінен выконвацца гэты загад. Бацькі школьнікаў павінны разумець, што "адаспацца" на год наперад за лета ўсё роўна не атрымаецца, а маладому арганізму стрэс у выглядзе змены рэжыму дня з адпускнога на працоўны толькі на шкоду.

2. Харчаванне павінна заставацца разнастайным і якасным. Не варта пераходзіць толькі на пірожаныя і марожанае.

3. Лета – самы спрыяльны час, каб разамнуць цела, якое цэлы год сядзела круком над падручнікамі. Займіцеся актыўным відам спорту: бегайце, плавайце, гуляйце ў тэніс, бадмінтон, футбол, валейбол, баскетбол або проста скачыце на скакалцы. І дарэчы, не забудзьцеся, што 2 тыдні актыўнага купання ў моры пазбавяць вас ад прастуды на ўвесь зімовы перыяд.

Чым асцярожней вы будзеце ставіцца да свайго арганізма падчас летніх вакацый, тым больш карысным атрымаецца ваш адпачынак.

Зараз жа непасрэдна пагаворым аб тым, як правесці лета з карысцю.

1. **Планаванне.** Гэта самы галоўны пункт, да якога трэба прыступіць хаця б за месяц да пачатку вакацый.

2. **Вандраванне.** Калі вы не можаце дазволіць сабе паехаць у іншую краіну, то, напэўна, ў вашым родным боку ёсць яшчэ непазнаныя вамі месца. Але раім ісці незвычайным шляхам.

3. **Праца.** Вядома, не варта прысвячаць гэтаму ўвесь свой вольны летні час, але хоць бы 1-1,5 месяцы неабходна надаць гэтаму пытанню.

4. **Навучанне.** Бацькі часта думаюць, што ўлетку дзіцяці не варта браць у рукі падручнікі і сшыткі. Гэтая памылка.

5. **Блізкія людзі.** Падчас вучобы так часта бракуе часу на сяброў, сваякоў. Таму прапаноўваем максімальна выкарыстаць летнія вакацыі для зносін. Вылучыце адзін дзень у тыдзень і праводзьце час у вясёлай кампаніі.

Лета рана або позна пераходзіць у восень. Таму, каб лягчэй было наладзіцца на працоўны лад, за два тыдні да 1 верасня пераходзьце на той рэжым дня, які вас чакае у вучальным годзе.

**Добрага ўсім адпачынку!**


| | | | |
|---|---|---|---|
| **НАШ ГОЛАС**<br>*Газета для вучняў, настаўнікаў і бацькоў* | **Заснавальнік –**<br>Мінойтаўская СШ<br>**Галоўны рэдактар –**<br>Хіневіч Н.М. | **Афармленне:**<br>Савет старшакласнікаў | **Адрас рэдакцыі:**<br>в.Мінойты, вул.Чырвонаармейская, 3, тэл. 597337 |